# 1945 Была нужна одна победа, вы за ценой не постояли! 2020

Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№35 (10953)



8 мая 2020 года
Пятніца

САЛДАТЫ ПЕРАМОГІ



Ветэран Сяргей Адзіночанка

# "Кацюша" для ветэрана

## Дабрушанін Сяргей Адзіночанка адным з першых у раёне атрымаў юбілейны медаль "75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне"

9 мая, прызнаецца 96-гадовы ветэран, яму хацелася б пайсці на гарадскую плошчу, ускласці да мемарыяльнага комплексу "Памяць" букецік вырашчаных на прысядзібным участку чырвоных цюльпанаў. Сустрэцца з баявымі сябрамі, якіх з кожным годам застаецца ўсё менш...

Святочным, хаця і з ноткамі суму, настроем удзельнік Вялікай Айчыннай вайны падзяліўся з тымі, хто прыехаў павіншаваць яго. Ад любімай "Кацюшы", што выканалі артысты раённага Палаца культуры, пажылы мужчына не стрымаў слёз. Гледзячы на невысокую постаць у строгім цывільным касцюме, спрабавала ўявіць хударлявага 16-гадовага падлетка з аўтаматам у руках.

(Заканчэнне – на 2 с.)

Фота Яўгена УСЦІНАВА

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 15.35
Луна
8 мая – в Скорпионе,
9, 10 – в Стрельце

Последняя четверть
14 мая

| 9 мая | 10 мая |
|---|---|
| НОЧЬЮ +5…+7 | НОЧЬЮ +8…+10 |
| ДНЕМ +12…+14 | ДНЕМ +16…+18 |
| Сплошная облачность. | Переменная облачность. |
| Без осадков. | Без осадков. |
| Ветер с.-западный 1-3 м/с. | Ветер с.-западный 4-6 м/с. |




## С праздником!

**Уважаемые ветераны! Дорогие земляки! Поздравляем вас с 75-й годовщиной Великой Победы!**

С памятного майского дня прошло немало лет. Но вы, кто своей грудью отстоял свободу Родины, для нас навсегда останетесь молодыми и отважными героями.

День 9 мая 1945 года вошел в историю победным салютом, всеобщим ликованием и слезами радости. Закончилась самая жестокая война в истории человечества.

Мы всегда будем помнить героев Великой Отечественной войны, павших в боях за свободу Отечества, умерших от непосильного труда во имя Победы. День Победы – самое радостное событие для участников Отечественной войны, тружеников тыла, в жизни всех, кто свято верил в силу наших воинов, партизан и подпольщиков, в силу народного духа.

Этот праздник связывает военное поколение с теми, кто родился после войны, возможностью учиться, мирно трудиться, счастьем растить своих детей обязан ветеранам.

Желаем нашим дорогим ветеранам, всем жителям района здоровья, благополучия, счастья, уверенности в завтрашнем дне и светлых надежд на будущее!

**Районный исполнительный комитет**
**Районный Совет депутатов**
**Районный совет ветеранов**

# "Кацюша" для ветэрана

**(Заканчэнне. Пачатак – на 1 с.)**

– Пачатак мая сёлета прахалодны, – на лаўцы каля дома з шыльдай "Тут жыве ветэран Вялікай Айчыннай вайны" Сяргей Фядосавіч стараецца перавесці размову на тэму, не звязаную з мінулым. Не атрымліваецца. – Вясной 1945-га было горача ва ўсіх сэнсах. У Берліне, праўда, пабываць не ўдалося. Ваяваў пераважна на тэрыторыі Беларусі. Вызваляў і Кіеў.

Дарэчы, ордэн Славы другой ступені, які дабрушанін, па яго словах, атрымаў за ўдзел у баявой аперацыі на тэрыторыі Украіны, і да гэтага часу не прыбыў да ўладальніка.

– Была думка самому ехаць па яго, ды час зараз неспрыяльны, і здароўе не тое, – расказвае Сяргей Адзіночанка.

Аб фізічным стане героя-вызваліцеля клапоціцца яго дачка з вопытам медыцынскага работніка. Але ўспамінамі бацькі пра вайну жанчына не дзеліцца. Ветэран, кажа, і сам добры расказчык, памятае ўсё да дробязяў.

– З ваенкамата нас павезлі на месяц у "вучэбку" пад Курск, – працягвае аповед Сяргей Фядосавіч. – Там першы раз і ўзяў у рукі зброю, паспрабаваў сябе ў ролі кулямётчыка. Наш 278 стралковы полк 48-й арміі накіравалі пад Гомель. На подступах да Лоева ішлі жорсткія баі. Наступленні камандзіры планавалі з надыходам ночы. Магутныя кананады з залпамі "Кацюш" клікалі нашых байцоў ісці толькі наперад. Без сну і адпачынку дайшлі да Лоева.

Тое, што асколак снарада зачапіў яго за плячо, Сяргей Фядосавіч лічыць шанцаваннем. Ля яго кулямёта разарваўся варожы снарад, а ён секундай раней адышоў па патроны. Дваіх баявых таварышаў Адзіночанкі тады забіла...

– Страшна было толькі спачатку, – дзеліцца ветэран. – Потым прывык і многаму навучыўся. Нават асвоіў, як "языка" браць. Трэба толькі ціхенька падпаўзці, гранату кінуць своечасова. Калі немцы адпачывалі і весяліліся, яны гублялі асцярожнасць. Такім момантам я і скарыстаўся. Немец аказаўся важнай асобай. А мяне за гэта ўзнагародзілі.

...Памятны медаль, уручаны да юбілею Перамогі, франтавік прымацаваў на пінжаку побач з іншымі асабліва каштоўнымі для яго ордэнам Славы, ордэнам Айчыннай вайны першай ступені. Ён шчыра падзякаваў прадстаўнікам улады за клопат і ўвагу. За тое, што ў святочныя дні ён не адзін.

**Людміла НАЗАРАВА**



Юбілейным медалём "75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне" ў гэтыя дні ўзнагароджаны 41 жыхар раёна. У іх ліку – 14 дабрушан. Гэта ветэраны, інваліды вайны, працаўнікі тылу і былыя вязні фашысцкіх канцлагераў. Медалі і падарункі ад абласнога выканаўчага камітэта цягам святочнага тыдня перададзены ўсім адрасатам.

УШАНАВАННЕ

# Франтавікі надзелі ордэны

Патанаючы ў зеляніне дворык паміж драўлянымі двухпавярхоўкамі па вуліцы Чапаева ў райцэнтры напоўніўся гукамі гармоніка. З салона аўтаклуба выйшлі дзяўчаты і хлопцы ў армейскіх гімнасцёрках. Артысты раённага Палаца культуры – у чаканні адзінага гледача, дзеля якога і прыехалі.

– Якія вы прыгожыя! – расчулены Валянцін Уласенка на хаду папраўляе ўзнагароды на пінжаку. – Дзякуй, што не забываеце.

Салістка Карына Талкачова заспявала "Сінюю хустачку", а Валянцін Емяльянавіч падпахіў любімую мелодыю.

– Мы загадзя пацікавіліся, якую песню хочуць пачуць ветэраны, – раскрылі невялікі сакрэт арганізатары акцыі "Пісьмо ветэрану".

Работнікі Палаца культуры падрыхтавалі для кожнага з удзельнікаў вайны віншавальны трохкутнік. Але ніякія словы не параўнаюцца з эмоцыямі, што выклікала выкананне песень, з якімі яны ішлі ў бой, адпачывалі на прывалах, сустракаліся з франтавымі сябрамі пасля вайны.

Жыхар вуліцы Дружбы 93-гадовы Фёдар Васілеўскі нават пусціўся ў скокі ля брамкі ўласнага дома, калі акампаніятар Аляксандр Фуклеў узяў знаёмыя акорды. "День Победы, как он был от нас далек..." – гэтыя словы нагадалі ветэрану яго абпаленае вайной юнацтва.

– З 14 год ён быў на фронце, дайшоў да Берліна, – расказала дачка вызваліцеля Ірына Жукава. – А спачатку – рамантаваў самалёты...

Памятны для ветэрана момант жанчына зняла на камеру планшэта. Каб падзяліцца падзеяй з унукамі, праўнукамі ветэрана, якія жывуць далёка ад Добруша.

**Людміла ФЁДАРАВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**



Валянцін Уласенка прымае віншаванні



Ветэран Фёдар Васілеўскі ўспомніў маладосць

ТЭМА НЕДЕЛИ

# «Они умирали ради нас»

**Президент Беларуси Александр Лукашенко подчеркивает глубокое идеологическое и эмоциональное значение парада в честь 75-летия Победы.**

«Надо помнить, что те люди (участники войны. – Прим. БелТА) умирали, может быть, и от вирусов, других болезней. Но они это не ощущали порой и об этом не думали. И умирали они ради нас, как бы это пафосно ни звучало. И подумайте, что скажут люди. Может, не сразу, через день, через два после этого, – скажут, что испугались», – заявил Глава государства.

Александр Лукашенко рассказал, что среди желающих посетить парад есть и ветераны Вооруженных Сил. «Участников войны осталось совсем немного. Они понимают, и мы должны их сберечь. Хоть они и первыми затребовали, чтобы их привезли на это мероприятие. Понятно, что им уже за 90. Подумаем, как с ними быть. Поэтому никого на это массовое мероприятие тащить не надо», – сказал Президент.

«Беларусь – это живой памятник той войны. И я думаю, что в этот день здесь могли бы присутствовать представители всех государств», – добавил он.

**По материалам БелТА**

НА СВЯЗИ

**11 мая с 10.00 до 12.00 по телефону 3-12-48**
пройдет прямая телефонная линия с участием Владислава Гисматовича ГАСЫМОВА, начальника отдела внутренних дел райисполкома.